**Список литературы**

1 **Мишаткина Т. В.** Педагогическая этика : учеб. пособие / серия «Высшее образование». – Ростов н/Д : Феникс ; Минск : ТетраСистемс, 2004. – 304 с.

2 Основы психологии и педагогики высшей школы / под ред. А. В. Петровского. – М., 1986.

УДК 811.161.3 :378.1

# ВЫКЛАДАННЕ МОЎ У ВНУ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ

*В. В. ШАХАБ*

*Жаночы інстытут ЭНВІЛА*

«Наш самы высокі набытак – Айчына, навука, сумленне». Гэтыя, на першы погляд, простыя радкі нашага славутага суайчынніка А. Міцкевіча можна ўспрымаць як своеасаблівы крытэрый сталасці грамадзяніна кожнай дзяржавы. Так, любоўю да Радзімы, Айчыны, Бацькаўшчыны спрадвеку вымяраецца грамадзянская годнасць кожнага чалавека. Глыбінны сэнс гэтых слоў, як ніколі, надзённы сёння, калі пытанні рэалізацыі нацыянальнай ідэі праз патрыятызм і патрыятычнае выхаванне з’яўляюцца прыярытэтнымі ў развіцці Рэспублікі Беларусь і, перш за ўсё, ўвасабляюцца ў адукацыйны працэс. Надзвычай пазітыўным фактарам у развіцці сучаснага беларускага грамадства бачыцца ўвага з боку дзяржавы да фарміравання творчай індывідуальнасці сучаснай моладзі, павышэння яе інтэлектуальнага, навуковага, маральна-этычнага і эстэтычнага патэнцыялу, што, у сваю чаргу, павінна забяспечыць рост і памнажэнне духоўнага багацця нацыі. Сутнасць сучаснай дзяржаўнай ідэалагічнай работы ў асяродку моладзі грунтуецца на ўсведамленні ўнутранай патрэбы ў цэласным разуменні адметнасці ўласных месца і ролі ў нацыянальным інтэлектуальным развіцці. Духоўнасць грамадства – вось той стрыжань, на які павінна абапірацца практычная стваральная дзейнасць годнага грамадзяніна сваёй краіны, вось той прыярытэтны напрамак, адметны і спецыфічны шлях народа да агульначалавечага, які не запавольвае рух дзяржавы і яе грамадзян наперад, а наадварот, натхняе да новых творчых і працоўных здабыткаў. «Гэта інтэгральная якасць, уласцівая людзям. Не столькі рэлігійнасць, адукаванасць, начытанасць, уменне разбірацца ў літаратурных стылях і мастацкіх напрамках, колькі стыль мыслення, паводзін і фантазіі чалавека і чалавецтва – усіх, хто адчуваў і адчувае сваё дачыненне да ўсяго таго, што робіцца ў сям’і, свеце, прыродзе, грамадстве, каго хвалююць паводзіны людзей, рэлігійных дзеячаў, грамадскіх аб’яднан-няў, груп, партый і інш. Духоўнасць – гэта паказчык высакароднасці і маральнасці людзей, іх

свядомасці, накіраванасці ўнутраных сіл, узлёту духу, фантазіі, творчасці» [1, с.10, 11].

На сучасным этапе развіцця айчыннай вышэйшай школы менавіта ***моўная адукацыя*** асэнсоўваецца з пазіцый максімальнай увагі да развіцця здольнасцей, якія неабходны асобе і грамадству, сацыяльна-каштоўнаснай арыентацыі студэнтаў у грамадстве, стымулявання бесперапыннай самаадукацыі пасля заканчэння навучальнай установы. Моўная і маўленчая культура выпускніка вышэйшай навучальнай установы асэнсоўваюцца як адна з найвышэйшых каштоўнасцей для чалавека і грамадства, вядучы і вызначальны фактар фарміравання патрыятычнай асобы, галоўны інструмент пераемнасці культуры пакаленняў.

***Родная мова*** разглядаецца як той стрыжань, які не толькі забяспечвае засваенне навучальных прадметаў, але і з’яўляецца асноўным сродкам, пры дапамозе якога адбываецца нацыянальна-культурная ідэнтыфікацыя і сацыялізацыя асобы, забяспечваецца яе трывалая сувязь з кандэнсаваным народным вопытам, што ляжыць у аснове ўсялякага адметнага развіцця. З’яўляючыся сродкам захавання этнічнай памяці, мова робіць чалавека здольным не толькі ўспрымаць і перапрацоўваць інфармацыю, але і арыгінальна мысліць жывымі вобразамі, суаднесенымі з этнічнай памяццю. Узровень такой памяці, выяўлены ў мове, дэтэрмінуе агульную духоўную культуру народа, што, у сваю чаргу, кансалідуе грамадства, робіць яго моцным і трывалым, узмацняе інтэлектуальны патэнцыял нашай суверэннай дзяржавы.

Сёння надзённым бачыцца пытанне: *як* на этапе вышэйшай адукацыі сістэмна забяспечыць бесперапынную моўную адукацыю чалавека і развіць тыя веды, аналітыка-сінтэтычныя і канструктыўныя ўменні і навыкі, што студэнты набылі на папярэдніх этапах вывучэння мовы ў школе.

Бясспрэчна тое, што вынікі навучання і выхавання асобы студэнта сродкамі беларускай мовы ў ВНУ залежаць перш за ўсё ад матывацыі навучэнцаў і навукова-метадычнай арганізацыі вучэбнага працэсу.

Выкладчыкі Жаночага інстытута ЭНВІЛА зыходзяць з таго, што на занятках па ***беларускай мове (прафесійная лексіка)*** вучэбны працэс перш за ўсё неабходна забяспечыць навучальнымі тэкстамі і дыдактычнымі матэрыяламі, суаднесенымі не толькі з патрабаваннямі праграмы, але і з рэальнымі сферамі духоўнасці (этыкі, культуры, маралі), актуальнымі для развіцця сучаснага грамадства (тэкстацэнтрычны падыход). Выкарыстоўваецца інфармацыйна насычаны, стылёва разгалінаваны, лексічна і сінтаксічна разнастайны тэкставы матэрыял, прапануецца надзвычай шырокі спектр паслятэкставых заданняў (напісанне эсэ, нарысаў, публіцыстычных прамоў; дадатковыя паведамленні прафесійнай і сацыяльна-культурнай тэматыкі; вывучэнне энцыклапедычнай і даведачнай літаратуры; самастойная пошукавая дзейнасць і г. д.), якія стымулююць развіццё вуснага маўлення.

Так паралельна з фарміраваннем уласна лінгвістычных паняццяў назапашваецца інтэлектуальны патэнцыял студэнтаў, а разам з тым набываюцца якасці духоўна сталай, маральна выхаванай асобы, здольнай адказваць за лёс краіны і лёс цывілізацыі, абараняць і адстойваць нацынальныя каштоўнасці і гуманістычныя традыцыі, захоўваць гармонію і камфорт у грамадстве і прыродзе.

Пры фарміраванні лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі выкарыстоўваюцца, акрамя ўласна лінгвістычных, адпаведныя паслятэкставыя заданні, якія стымулююць самастойную пошукавую і інтэлектуальную дзейнасць студэнтаў па грамадзянска-патрыятычнай тэматыцы.

**Прыклад :**

**Заданне:** Напішыце сачыненне тыпу разважання на тэму «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Выкарыстайце ў якасці эпіграфа ніжэйпрыведзеныя словы В. Дуніна-Марцінкевіча:

*Што мне пекны Парыж, Рым прыгожы і слынны,*
*Што швейцарскія горы, старыя Афіны,*
*Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны,*
*Больш за ўсё я бацькоўскаму краю аддадзены!*

**Заданне:** Прачытайце тэксты. Падрыхтуйце камп'ютарную прэзентацыю па тэме «Беларусь – краіна тваёй будучыні».

(Для працы прапануецца інфармацыя з афіцыйнага Інтэрнэт-парталу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) .

**Заданне:** Распрацуйце творчы праект на тэму «Славуты беларускі навуковец». Зрабіце яго прэзентацыю ў студэнцкай групе.

**Заданне:** Адшукайце звесткі пра знакамітых постацяў сваёй малой радзімы. Падрыхтуйце прэзентацыю аб іх дзейнасці.

**Заданне:** Падрыхтуйце прэзентацыю «Беларускія слоўнікі ў прафесійнай дзейнасці перакладчыка; менеджара; псіхолага».

***Замежная мова*** ўтварае перадумовы для фарміравання асобы інтэрнацыянальнай і талерантнай, здольнай не толькі ўсвядомлена карыстацца мовай на ўзроўні элементарных зносін, але і аператыўна засвойваць і трансфармаваць перадавы замежны навуковы вопыт, годна прадстаўляць інтарэсы сваёй краіны на сусветных прасторах.

Прывядзём прыклады рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу некаторых лінгвістычных дысцыплін выкладчыкамі Жаночага інстытута ЭНВІЛА.

Напрыклад, ***лацінская мова*** на працягу доўгага часу была адной з асноўных моў еўрапейскай адукацыі, у тым ліку і беларускай, а да XVIII ст. – міжнароднай мовай навукі. На сённяшні дзень лацінская мова застаецца крыніцай фарміравання навуковай тэрміналогіі, міжнароднай мовай медыцынскай наменклатуры і прыродазнаўчай сістэматыкі. Усе гэтыя фактары робяць яе адной з пажаданых навучальных дысцыплін для вывучэння ў вышэйшай школе.

Аднак часта пры выкладанні дысцыпліны недаацэньваецца яе выхаваўчы патэнцыял, які пры належнай пастаноўцы ідэалагічнай працы выкладчыка можа пашырыць уяўленні студэнтаў пра грамадзянскасць і патрыятызм. Таму вычарпальную ўвагу пры навучанні дысцыпліне трэба звяртаць не толькі на яе філалагічны аспект, але і яе агульнакультурны кантэкст. Пашырэнню агульнага культурнага кругагляду студэнтаў на занятках лацінскай мовы спрыяе старанны падбор навучальнага матэрыялу (арыгінальныя тэксты, афарызмы), яго падрабязны гісторыка-культурны каментарый, а таксама некаторыя формы самастойнай працы студэнтаў (праца са слоўнікамі і даведачнай літаратурай, падрыхтоўка рэфератаў і паведамленняў на тэмы, звязаныя з антычнай культурай).

Мэтай ідэалагічнай працы на занятках па лацінскай мове з’яўляецца не толькі павышэнне агульнага культурнага і маўленчага ўзроўню навучэнцаў, актыўнае азнаямленне студэнтаў з антычнай прававой культурай, але і паказ найлепшых узораў грамадзянскасці і патрыятызму ў кантэксце антычнай культуры і праекцыя выхаваўчых і ідэалагічных каштоўнасцей антычнага свету на сучаснасць.

Гэта вырашаецца праз разуменне студэнтамі поглядаў антычнага чалавека адносна дзяржавы і права; усведамленне ролі антычнай культуры ў станаўленні еўрапейскай цывілізацыі і засваенне ідэйна-патрыятычных каштоўнасцей антычнасці.

Для рэалізацыі выхаваўча-ідэалагічнага патэнцыялу курса «Лацінская мова» найважнейшае значэнне мае распрацоўка спецыяльных дадатковых заданняў на паглыбленне агульнакультурных ведаў, падрыхтоўка выкладчыкам прадуманых лінгвакультуралагічных каментарыяў да вучэбнага матэрыялу, а таксама навукова-даследчая праца студэнтаў.

У інстытуце сістэматызаваны практычны вопыт ідэалагічна-выхаваўчай працы на занятках лацінскай мовы. На прыкладзе канкрэтных заданняў і навуковых артыкулаў, падрыхтаваных выкладчыкам і студэнтамі пад яго кіраўніцтвам, паказваюцца магчымасці выкарыстання выхаваўчага патэнцыялу дадзенай дысцыпліны ў вышэйшай школе.

**Прыклад фрагменту заняткаў па тэме «Лацінская афарыстыка і патрыятычнае выхаванне»:**

**Заданне:** Перакладзіце ніжэйпададзеныя лацінскія выслоўі, выкарыстоўваючы слоўнікі лацінскіх афарызмаў. Пры выкананні задання асаблівую ўвагу звярніце на гісторыка-культурны кантэкст фразеалагічных адзінак, у каментарыі раскрыйце іх выхаваўчае значэнне, суаднясіце іх з рэаліямі сучаснага жыцця.

**Узор выканання задання:**

**Salus populi – suprema lex** (Дабро народа – найвышэйшы закон).

Словы належаць Цыцэрону, «Аб законах», III, 3, 8: *Regio imperia duo sunto, iiquer praeeundo, iudicando, consulendo praetores, iudices, consules*

*appllamino; militiae summum ius habento, nemino parento, illis salus populi suprema lex esto*. «Няхай двое будуць надзелены каралеўскай уладай і, кіруючы, судзячы і трымаючы нараду, называюць сябе прэтарамі, суддзямі, консуламі; у ваенны час няхай яны маюць найвышэйшую ўладу, нікому не падпарадкоўваюцца, вышэйшым законам для іх няхай будзе дабро народа».

**Каментарый**: У сваім дыялогу «Аб законах» Цыцэрон, пераймаючы стыль старажытных заканадаўчых помнікаў, абмалёўвае асновы ідэальнага дзяржаўнага ладу.

**Выслоўі для перакладу (падаюцца асобна), напрыклад**: *Civis Romanus sum. Pacta sunt servanda. Deserta faciunt et pacem appellant. Vox populi, vox dei. A Deo rex, a rege lex*.

***Англійская і нямецкая мовы*** – надзвычай важны элемент прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. І тут таксама маецца надзвычай істотны грамадзянска-патрыятычны патэнцыял.

Напрыклад, на занятках па ***нямецкай мове*** выкладчыкі прапануюць студэнтам пазнаёміцца з буйнейшымі выставачнымі пляцоўкамі Беларусі і Германіі, засяроджваючы ўвагу на тым, як наша краіна наладжвае міжнародныя кантакты ў сферы прамысловасці і культуры і звяртаючы ўвагу на тыя першасныя задачы, якія неабходна вырашаць прадстаўнікам дзяржавы на гандлёва-эканамічных форумах.

**Прыклад фрагменту заняткаў па тэме «Deutschland und Belarus – Messeländer».**

**Мэта заняткаў**: развіццё ўменняў пошуку, апрацоўкі і падачы інфармацыі на замежнай мове.

**Камунікатыўная мэта**: азнаямленне студэнтаў з найбуйнейшымі выставачнымі цэнтрамі Германіі і Беларусі.

**Выхаваўчыя мэты**: пашырэнне кругагляду, культуралагічнае параўнанне выставачных традыцый Беларусі і Германіі.

**Маўленчы матэрыял**: лексіка па тэме «Выставы», інтэрнэт-спасылкі.

**Аснашчэнне заняткаў**: прэзентацыя WebQuest, камп'ютарны клас з доступам у Інтэрнэт.

**Einführung (Уводзіны ў тэму):**

*Deutschland und Belarus sind die international führenden Standorte für Messen und Ausstellungen. Fünf der zehn größten Messegesellschaften der Welt stammen aus Deutschland. Jährlich werden zwischen 150 und 160 internationale Messen und Ausstellungen durchgeführt, die von ca. 170.000 Ausstellern genutzt und 9–10 Millionen Besuchern besucht werden. Deutschland verfügt über 20 Messestädte.*

*In Belarus ist die Tradition nicht so lang. Minsk ist der größte Ausstellungsort. Jährlich finden hier über 20 internationale Ausstellungen statt.*

*In dieser WebQuest geht es um drei Messestädte in Deutschland und über Ausstellungen in Belarus. Nachdem Sie Station 1 lösen, wissen Sie, um welche Städte es in unserer WebQuest geht.*

**Aufgaben (Заданні):**

У якасці заданняў прапануецца правесці самастойнае даследаванне па гісторыі развіцця сучаснай выставачнай дзейнасці ў асобных рэгіёнах Германіі і Беларусі (інтэрнэт-старонкі).

**Ressourcen (Рэсурсы):**

Выкладчыкам прапануюцца каля 20 інтэрнэт-крыніц для вывучэння тэмы па выставах Лейпцыга, Мюнхена, Франкфурта, Мінска і іншых гарадоў Беларусі. Праца арганізуецца ў групах. Кожная група праводзіць самастойнае даследаванне, вынікі якога прадстаўляюцца на апошнім занятку-калоквіуме.

Немалаважнай з’яўляецца самаацэнка, якая афармляецца ў адпаведных табліцах, што дэталёва ўлічваюць усе аспекты падачы матэрыялу.

**Рэфлексія: Prüfen Sie hier Ihre Kompetenzen und Kenntnisse!**

*Was ich kann...*

*Ich kann Infos im Internet finden.*

*Ich kann eine Präsentation herstellen.*

*Ich kann mit meinen Kollegen arbeiten.*

*Ich kann meinen Kollegen meine Lieblingsstadt vorstellen.*

*Was ich kenne...*

*Ich kenne Informationen über die wichtigsten internationalen Messen, die in Deutschland stattfinden.*

*Ich kenne Informationen über die Geschichte der Messestädte Leipzig, Frankfurt und München.*

*Ich kenne einige Webseiten, die sich mit internationalen Messen beschäftigen.*

*Sie haben viel und hart gearbeitet!*

На занятках па ***англійскай мове***, акрамя ўласна лінгвістычных, вырашаюцца пытанні глыбокай інтэграцыі дадзенай мовы ва ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства. Падкрэсліваецца, што здольнасць членаў грамадства ажыццяўляць англамоўныя зносіны сведчыць пра дастаткова высокі ўзровень адукаванасці краіны ў цэлым. Акрамя таго, наяўнасць у выпускніка ВНУ міжмоўнай кампетэнцыі дазваляе яму пераймаць і інтэграваць ва ўласную стваральную дзейнасць на карысць сваёй краіны лепшыя набыткі замежнай навуковай і прафесійнай думкі.

**Прыклад фрагменту заняткаў па тэме «If You Were Asked To Represent Your Country At An International Meeting What Would You Speak About?»**

**Мэта заняткаў:**

Развіццё камунікатыўных навыкаў на замежнай мове.

Пашырэнне грамадзянскай кампетэнцыі студэнтаў.

**Задачы:**

Выпрацоўка навыкаў маналагічнага маўлення, непадрыхтаванага дыялагічнага маўлення, вядзення палілогу, стымуляванне патрыятычных пачуццяў студэнтаў праз вывучэнне матэрыялаў пра родную краіну.

**Метад:** ролевая гульня.

**Папярэдняя падрыхтоўка:**

Студэнтам прапануецца падрыхтаваць прэзентацыю пра сваю краіну для міжнароднай канферэнцыі па адным з прапанаваных напрамкаў:

*Гісторыя Беларусі. Культура Беларусі. Прамысловасць Беларусі. Развіццё спорта ў Беларусі. Традыцыі і святы ў Беларусі. Менталітэт беларусаў. Беларуская кухня. Беларусь турыстычная.*

Кожная прэзентацыя павінна быць яркай і цікавай, пададзена з дапамогай мультымедыя. Студэнт, які рыхтуе выступленне, павінен быць гатовым да пытанняў па тэме ад слухачоў.

**Форма заняткаў:**

Студэнцкая група з’яўляецца аўдыторыяй міжнароднай канферэнцыі. Кожны слухач у сваю чаргу – дакладчык.

Выкладчык кіруе працэсам. Пасля кожнай прэзентацыі арганізуецца абмеркаванне атрыманай інфармацыі і пытанняў.

Як адзначалася раней, натуральным бачыцца працэс патрыятычнага выхавання, заснаваны на нацыянальных і інтэрнацыянальных здабытках, увасобленых перш за ўсё ў мовах. Сацыялізацыя асобы пачынаецца ад нараджэння і працягваецца ўсё жыццё чалавека. Чым бліжэй культура сям’і і сацыяльнага асяроддзя, у якім расце чалавек, да ўнармаванага сацыяльна-этычнага стылю паводзін, тым глыбей адбываецца спасціжэнне традыцыйных узораў паводзін і светапогляду, усведамленне самакаштоўнасці чалавечага жыцця, суаднесенага з сацыяльна-культурным кантэкстам жыцця народа.

Агульнавядомы той факт, што выхоўвае чалавека ўжо сама прыналежнасць або далучэнне да пэўнай супольнасці, багатай сваімі традыцыямі. Таму выбар стратэгіі жыццёвых паводзін сучаснага маладога чалавека павінен быць свядомым, матываваным, заснаваным на інтарэсах пэўнага індывіда – прадстаўніка той або іншай нацыянальнай супольнасці. Нам, выкладчыкам вышэйшай школы, неабходна браць са скарбонкі айчыннай навукі і культуры ўсё тое, што складае аснову жыццядзейнасці гарманічна развітай асобы, якая не можа ўяўляць сябе па-за народам, часткай якога ёй наканавана быць лёсам. Як кожны чалавек мае свой уласны твар, так і народ мае сваё ўласнае аблічча, якое неабходна падтрымліваць у парадку, не руйнуючы, а развіваючы ўсё лепшае і адметнае.

Відавочным застаецца і той факт, што ў свеце няма мацнейшай сілы ўздзеяння на чалавека, чым тая, якую нясуць мовы і культуры народаў, спрыяючы станаўленню інтэлектуальнага, нацыянальна-культурнага і патрыятычнага аблічча грамадзяніна сваёй краіны. Этап набыцця вышэйшай адукацыі – не апошні ў сістэме развіцця асобы, але ў той жа час вельмі важны, бо пэўным чынам сінтэзуе інтэлектуальныя і маўленчыя набыткі чалавека, забяспечваючы трывалую аснову для далейшай бесперапыннай самаадукацыі чалавека.

Ідэалогія сучаснасці – у фарміраванні стылю думак і паводзін самога грамадства, у выхаванні ўсебаковай адказнасці грамадзян за ўласны лёс і лёс сваёй краіны. Толькі так можна захаваць уласную адметнасць, нацыянальны характар і тое патрыятычнае асяроддзе, якое будзе працаваць на будучыню нашай краіны.

**Спіс літаратуры**

1 **Протчанка, В. У.** Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мінск : НІА, 2001. – 213 с.

УДК 378.1 : 004

## СИСТЕМА РАБОТЫ С ТВОРЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖЬЮ НА КАФЕДРЕ «СИСТЕМЫ ПЕРЕДАЧИ ИНФОРМАЦИИ»

*В. Г. ШЕВЧУК*

*Белорусский государственный университет транспорта*

В 2006 году на кафедре сложилась сложная кадровая ситуация: средний возраст преподавательского состава кафедры составлял 52,5 года, а имеющих ученые степени и звания – более 62 лет. Затем сразу несколько ведущих преподавателей по причинам разного характера покинули кафедру. Поэтому потребовалось срочное «хирургическое вмешательство». К преподавательской работе были привлечены молодые выпускники кафедры. Это стало возможным благодаря работе кафедры с творческой молодежью. Мощным толчком к активизации этой работы и приданию ей системного характера послужил приказ ректора университета № 207 от 09.03.2009 г.

В настоящее время на кафедре создана система работы с творческой молодежью, алгоритм которой приведен на рисунке 1.

Развитие личностного потенциала студентов напрямую связано с формированием их профессионального самосознания, выступающего фундаменталь-ным условием развития личности профессионала.

Одним из видов работ, позволяющим решать данные задачи, является научно-исследовательская работа студентов и магистрантов. НИРС является одной из важнейших форм самостоятельной работы студентов по приобретению знаний и навыков самостоятельного решения инженерных и научных задач [1].

При организации работы с творческой молодежью целесообразно использовать следующие принципы:

– заинтересованность студентов – результаты их исследований становятся фундаментом исследовательской части дипломного проекта;

– добровольность и систематичность работы в кафедральных кружках НИРС;